Беларусь. Belarus

05.06.2019

# Далёкае і блізкае

Іван Ждановіч

**Першы нумар часопіса «Беларусь» за 1944 год зберагаецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Да 75-годдзя з часу адраджэння выдання ў рэдакцыю часопіса «Беларусь. Belarus» пры пасрэдніцтве намесніка дырэктара НББ Алеся Сушы перададзены фотакопіі ўсіх 48 старонак таго гістарычнага нумара.**


Встреча

В борьбе за независимость

Адзін з развваротаў часопіса

Цяпер, нагадаем, часопіс распаўсюджваецца ў розных краінах, ёсць і ў інтэрнэце: беларускамоўная версія — на партале Выдавецкага дома «Звязда», англамоўная — па адрасе https://issuu.com/belarus.mag.

Варта ўдакладніць важныя дэталі з гісторыі часопіса, заснаванага ў 1930 годзе. Дарэчы, першым яго рэдактарам (1930–1932) быў пісьменнік Міхась Чарот. А дэталі былі выпісаны ў тэксце «Рэабілітацыя «Чырвонай Беларусі», змешчаным у № 1 (812) за сту-

дзень 2000 года — нумар прысвячаўся 70-годдзю выдання. Цытуем: «Тады часопіс не судзілі. У 33-м яго папросту закрылі, спаслаўшыся на нястачу паперы ў краіне. А з студзеня 44-га ён выйшаў пад новай назвай «Беларусь» — з новым адказным рэдактарам Ільёй Гурскім і новай нумарацыяй. Як быццам да вайны часопіса і не было».

Можна зразумець тую «забыўлівасць» заснавальнікаў адноўленага выдання так: не хацелі ў ваенны час, як кажуць, варушыць старое-мінулае. А ўзнаўленне часопіса «Беларусь» у часе вайны было дзеяй ваенна-стратэгічнага парадку. Ідэалагічнай зброяй у барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі.

Каштоўнае сведчанне на гэты конт пад красамоўным загалоўкам «Як адраджалася «Беларусь» пакінуў Максім Лужанін («Беларусь», № 1, 2000). Пісьменнік апісвае, як на пачатку 1943 года ён у Маскве «чакаў новага прызначэння пасля Сталінграда і меў магчымасць вярнуць радасць яднання з старымі сябрамі». Зносіны ж тыя адбываліся пераважна ў сталічным гатэлі «Москва», якая пераўтварылася ў своеасаблівы беларускі цэнтр. «Часцей за ўсё гутарылі з Кузьмой Чорным па-зямляцку — абодва случакі, і Пятром Глебкам — таварышам па вучобе. Былі яшчэ ў Маскве Кандрат Крапіва і Міхась Лынькоў. Сумесныя вечары нашы былі поўныя ўспамінаў пра радзіму, пра сустрэчу з ёй: што там засталося, як жывецца-вядзецца. Вера ў зварот была непахісная, планаў на будучыню — мноства.

Клопат пра будучыню рэспублікі няспынна паджыўляў Панцелеймон Кандратавіч Панамарэнка. Першы сакратар ЦК КПБ, начальнік Цэнтральнага партызанскага штаба, ён пільна дбаў пра развіццё культуры, пра дапамогу ёй, нават пра кожнага з яе стваральнікаў паасобку. Аднойчы пасля прыёму ў яго мае таварышы вярнуліся, што называецца, пры пасадах: Ілья Гурскі — рэдактарам часопіса «Беларусь», які павінен быў пачаць новае жыццё: у 1933 быў спынены выхад часопіса «Чырвоная Беларусь». А Пятру Глебку даручылі разгортваць выдавецкую справу, ён стаў галоўным рэдактарам выдавецтва «Беларусь».


Е. МОЗОЛЬКОВ

Змитрок Бядуля

З. Бядуля  Скульптура З. АЗГУРА

Прошло два года со дня смерти Змитрока Бядули. В его лице белорусский народ потерял выдающегося писателя, горячего патриота и верного сына Советской Белоруссии.

Змитрок Бядуля впервые выступил в белорусской литературе в 1910 г. В газете «Наша Ніва» он напечатал стихотворение «Начлежнікі пяюць». С тех пор его стихи и рассказы часто встречаются на страницах «Нашай Нівы» и в других белорусских изданиях. В 1913 году в издательстве «Загляне сонца і ў наша аконца» вышел первый сборник рассказов Бядули «Абразкі».

Змитрок Бядуля (С. Плавник) родился в 1886 г. в глухом белорусском местечке Посадец, бывшего Вилейского уезда. Дед писателя — мелкий ремесленник, отец — промышлял извозом, возил купеческий лес, работал на лесоразработках.

Двенадцатилетнего мальчика родители отдали в «ешибот»—еврейское духовное училище. «Три года плавал я в мёртвом море талмудических наук»—читаем мы в яркой и задушевной автобиографической повести Зм. Бядули «У дрымучых лясах». Эта повесть — поэтическая история детства и отрочества писателя. В 1902 году Бядуля бросил ученье в ешиботе и снова вернулся в родной Посадец. Зимой он работал на лесоразработках, летом — на сплаве. Днём и ночью его окружали лесорубы, сплавщики. Здесь он хорошо узнал белорусский быт, язык, белорусские сказки, легенды, поверья.

Вторая книга рассказов Бядули «На зачарованых гонях» вышла в свет в 1923 году. Минуло десять лет с тех пор, как появились «Абразкі». За эти десять лет белорусский народ прошёл суровый и героический путь. В жестокой борьбе он отстоял свою свободу и независимость. Общий подъём, царивший в культурной, общественной и хозяйственной жизни Белоруссии, оказал самое благотворное влияние на творчество Змитрока Бядули. Одна за другой выходят его книги: «Пад родным небам» (вершы — 1922 г.), «Буралом» (вершы — 1924 г.), «Апавяданні» (1926 г.), «Выбраныя апавяданні» (1926 г.), «Дзьмгатка» (апавяданні—1928 г.) и т. д. До 1926 года Бядуля пишет и прозу, и стихи, затем почти исключительно — прозу.

Из рассказов Бядули нашенивского периода выделяются «Летапісцы», «Умарыўся», «Тулягі», «Сымон» и др.

Эти рассказы о несчастных, обездоленных людях, о жизни, которая калечит людей не только физически, но и духовно, как нельзя лучше характеризуют одну из главных особенностей творчества Бядули,—его исключительную человечность.

Большое место в творчестве Бядули занимают произведения, посвящённые борьбе белорусского народа против польских захватчиков. В рассказах «Маці», «На балоце», «Дзеснік» и др. Бядуля рисует незабываемые картины изгнания польских легионеров из Белоруссии в 1920 г.

В результате побед Красной Армии война с интервентами закончилась. Советская Беларусь вступила в период мирного социалистического строительства. Свою радость по поводу первых успехов любимой Родины в мирном созидательном труде хорошо выразил Бядуля в стихотворении «Беларусь» (1923 г.).

...А Беларусь магутная будзённая
Куе свой лёс, будуе новы быт.
Усюль жыццё бурлівым крыніцам,
Нікому кут у краі не забыт.

О свободной, счастливой жизни белорусского народа до нападения на Советский Союз гитлеровской Германии Змитрок Бядуля создал немало ярких, талантливых рассказов: «Сялянка Фрэйда», «Шрам», «Крушыня», «Дзед Арцём» и др.

В годы советской власти Змитрок Бядуля написал все свои наиболее зрелые и значительные произведения, талант его вырос, окреп. Известная повесть Бядули «Салавей», написанная им в 1927 году, принадлежит к числу лучших произведений белорусской прозы. В повести рассказывается о восстании белорусских крестьян против польского помещика в начале XIX века. Мужественную борьбу крестьян возглавил Сымон Соловей, талантливый крепостной артист-самородок.

В 1928—31 гг. Змитрок Бядуля написал двухтомный роман «Язэп Крушынскі» о классовой борьбе в деревне, а в 1935 г. им написана повесть «Набліжэнне» о быте еврейского местечка во время первой мировой войны.

Блестящий знаток фольклора, Бядуля с большим мастерством пользовался образами и приёмами народной поэзии. В основу его поэмы «Палескія байкі» (1922 г.) положен богатейший полесский фольклор. Целый ряд фольклорных мотивов использован им в повестях «Салавей» и «У дрымучых лясах». Одной из отличительных черт поэтики Бядули является народность эпитетов, сравнений и языка вообще.

Повесть «У дрымучых лясах»—последнее крупное произведение Зм. Бядули. Его творческая работа была прервана разбойничьим нападением на СССР гитлеровской Германии. Бядуля вынужден был покинуть родной Минск. Тяжёлые переживания ухудшили и без того слабое здоровье; больное сердце не выдержало, и 3 ноября 1941 г. Бядули не стало.

Змитрок Бядуля известен далеко за пределами Белоруссии. Его произведения неоднократно переводились на русский, украинский, грузинский, литовский, татарский, еврейский, польский, итальянский и др. языки. Кроме художественных произведений, его перу принадлежат многие литературно-критические статьи, исследования по истории белорусского театра, этнографии, фольклору. Он много лет работал редактором, журналистом.

За выдающиеся заслуги в деле развития советской литературы Правительство в 1939 г. наградило Зм. Бядулю орденом Трудового Красного Знамени.

Змитрок Бядуля верно и преданно любил свою Родину, был пламенным патриотом. В стихотворении «Паходні» (1922 г.) он с гордостью говорит о славном прошлом белорусского народа, о знаменитых памятниках белорусской культуры, о Литовском статуте, о трудах Скорины. Соратник Я. Купалы, Я. Коласа и М. Богдановича, старейший деятель белорусской литературы, Бядуля сыграл большую роль в деле ее развития. Своим творчеством, благородным, самоотверженным трудом он заслужил любовь и благодарность белорусского народа. С полным правом он сказал о себе:

Пануе — не памрэ безупынная сіла,
Што думы пад неба да зорак насіла,

Любовь к Белоруссии, к белорусскому народу — вот та «безупынная сіла», которая помогала Зм. Бядуле подняться к вершинам творчества.

28

29

Фрагмент з артыкула пра беларускага пісьменніка Змітрака Бядулю

Далей Максім Лужанін згадвае, што жылі Гурскі з Глебкам у той ваенны час у маленькім пакойчыку гатэля «Якорь», каля Беларускага вакзала. «Можна сказаць, што ў тым пакойчыку адбываліся пашыраныя пасяджэнні рэдкалегіі адноўленай «Беларусі». Старанна выбіраўся фармат, сталае аздабленне вокладкі, падбіраўся ілюстрацыйны матэрыял. А галоўнае — змест! Часопіс з першага нумара павінен быў зацікавіць чытача. Такім чынам, змест нумара некалькі разоў перατрасаўся. Удакладняўся, пашыраўся. У мяне доўгі час захоўваўся гэты першы нумар, пакуль не трапіў на вока вельмі заядламу букіністу. Не помню, ці трапілі мае радкі ў той першы нумар, але цвёрда ведаю: Гурскі, гаспадар запаслівы, забраў у мяне ўсё, што было напісана. Каб партфель паўнейшы быў, сказаў ён».

Гартаем першы нумар часопіса «Беларусь» за 1944 год — радкоў Максіма Лужаніна там не знаходзім. І ўвогуле «двухмесячный общественно-политический и литературный журнал» з дэвізам «Смерть немецким захватчикам!» на першай старонцы выдаваўся тады па-руску. Нават змешчаныя ў 1-м нумары вершы Петруся Броўкі, Якуба Коласа, Пімена Панчанкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Піліпа Пестрака, Аркадзя Куляшова, байка Кандрата Крапівы «Янка и Карл» пададзены ў перакладах на рускую мову. Толькі загаловак «перадавога» рэдакцыйнага артыкула пададзены па-беларуску: «Дзень добры, Беларуская зямля!». Калі ён пісаўся — вынікае з пераліку: «Уже освобождены белорусские города — Гомель, Климовичи, Кричев, Чериков, Мстиславль, Ново-Белица, Добруш, Хотимск, Речица, Пропойск, Журавичи и др. Близок день полного очищения нашей родны от поганых чужеземцев».

Доўга і пасля вайны давялося чакаць, пакуль была ўзноўлена повязь часопісаў «Чырвоная Беларусь» і «Беларусь». Першы публічны акт такой «рэабілітацыі» «Чырвонай Беларусі»

быў учынены ў 1982 годзе: тады намаганнямі галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь» Аляксандра Шабаліна (які, дарэчы, узначальваў яго больш за 30 гадоў!) у 9-м нумары ў выходных звестках замест радка «заснаваны ў 1944 годзе» з’явілася «заснаваны ў 1930 годзе». Менавіта ў 1982-м на падставе матэрыялаў і дакументаў, якія тычацца гісторыі часопіса, была прынята і пастанова ЦК КПБ («Беларусь», 1982, № 9) аб устанаўленні пачатку выдання часопіса — з часу выхаду першага нумара часопіса «Чырвоная Беларусь»: са студзеня 1930 года. І толькі калі ўжо выданне адзначала 70-годдзе, да агульнай нумарацыі часопіса былі дададзены яго даваенныя 79 нумароў.

Прыгледзімся: чым быў адметны той, першы нумар часопіса «Беларусь» за 1944 год?

На першай старонцы вокладкі — партрэт у паўпрофіль генералісімуса Іосіфа Сталіна: у фуражцы, шынялі. Ніжэй — назва выдання. Праўда, літары Б і Ь, пэўна, у працэсе брашуроўкі былі абрэзаныя. Пад словам «Беларусь» ідзе невялічкая палоска сціплага арнаменту, нумар пазначаны рымскай лічбай I, трохі ніжэй — год 1944 і пяцікутная зорка, таксама ў нейкім просценькім кветкавым арнаменце.

Калі першая тэма нумара — вызваленне ўсходніх раёнаў Беларусі, то другая — «25 лет БССР». Юбілей быў 1 студзеня 1944 года. Артыкул пад такой назвай падае «Т. Горбунов Секретарь ЦК КП (б)Б». У ім — апісанне даваенных поспехаў Беларусі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама таго гора й разбурэнняў, якія прынеслі ворагі. Ухваляецца масавы партызанскі рух, што разгарнуўся ў Беларусі, называюцца прозвішчы Герояў Савецкага Саюза родам з гэтай зямлі, якую вызваляюць ад ворага прадстаўнікі розных народаў СССР. І ўжо «заря освобождения занялась над многострадальной Белоруссией».



Адзін са здымкаў у першым ваенным нумары часопіса з надпісам «Привет родной Красной Армии!»

А ў тэксце «В борьбе за независимость» Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М. Наталевіча знаходзім такое выказванне: «Белоруссия оккупирована, но не покорена, она живет и борется. Белорусы не оказались той «глиной», из которой гитлеровские горе-горшечники собирались лепить «горшки» для арийских людоедов. Наоборот, белорусы оказались тверже гранита, инициативными и способными мастерами в той же глине, которой, кстати сказать, в Белоруссии очень много, укладывать немецких разбойников сотнями тысяч». Сцвярджаецца, што партызанскі рух стаў грознай сілай для нямецкіх акупантаў: «Сейчас на территории Белоруссии действуют сотни партизанских отрядов и бригад, объединяющие свыше 100 тысяч партизан». Прыводзіцца такая лічба: друкарскім спосабам у тыле ворага выпускаецца 73 газеты, а лістоўкі — кожным партызанскім атрадам. Падаецца вялікі пералік партызанскіх спраў, якія сведчаць пра шырокі размах партызанскай барацьбы.

Намеснік старшыні СНК БССР М. Крупеня ў артыкуле дзеліцца сваімі ўражаннямі ад таго, што пабачыў на вызваленых тэрыторыях Беларусі — у Крычаўскім, Хоцімскім, Мсціслаўскім, Клімавіцкім раёнах. А галоўны герой апавядання Міхася Лынькова «Астап» вяртаецца зімой з лесу на месца спаленай карнікамі роднай вёскі, у агні якой згарэлі нявестка з двума ўнукамі, ды ўсё думае сваю думу: «как найти меру святой человеческой мести». І калі ў вёску ў той жа дзень прыходзяць пад выглядам беглых савецкіх ваеннапалонных ворагі, выпытваюць дарогу да партызан, то стары ляснік Астап робіць свой выбар і заводзіць «няпрошаных гасцей» у непраходны заснежаны забалочаны лес. Там і гіне — разам з імі. Апавяданне стала шырокавядомым, з пасляваеннага часу вывучаецца ў беларускіх школах.

Усе тэксты, фотаздымкі, змешчаныя ў 1-м нумары часопіса «Беларусь» — гэта заклік да барацьбы з ворагам, заклік набліжаць усімі супольнымі сіламі Дзень вызвалення Беларусі, Дзень Перамогі.